ляе такія рысы, як удаласць, храбрасць, чэснасць, сумленнасць. Таму вобраз "добрага малайца" з поўным правам выступае у народным выхаванні як узор для пераймання.

Праца, як вядучая форма дзейнасці чалавека, фарміруе самаразуменне асобы, вызначае ле маральныя пазіцыі у калектыве. Гэта старонка выхавання так сама багата адлюстравана у беларускім фальклоры (напрыклад, у каляндарна-земляробчым цыкле абрадаў і святаў). Спрадвеку ушаноўваліся у народнай педагогіцы калектыўная праца, гатоўнасць да дапамогі, падтрымкі, што яскрава адлюстравана у так званых "Талочных песнях".

Магутнасць выхаваўчага уздзеяння педагагічных традыцый народа шмат у чым вызначаецца іх багатай эстэтычнай змястоўнасцю. Таму у этнапедагогіцы вялікая роля адводзіцца эстэтычнаму пачатку, калі педагагічныя ідэі і усведамленні увасабляюцца у канкрэтна-пачуццевую сімвалічную форму і праз эмацыянальныя і эстэтычныя адчуванні глыбока усвойваюцца асобай падсвядома, становячыся натуральнай нормай паводзін. Калядкі, гуканне вясны, купалле, зажынкі – гэта непаўторныя па сваёй дасканаласці рытуальных дзеянняў і эмацыянальнаму уплыву тэатралізаваныя сцэны народнага жыцця.

Такім чынам, знаемства з выпрацаванай стагоддзямі педагагічнай спадчынай народа сведчыць аб яе невычарпальных магчымасцях у справе выхавання падрастаючага пакалення. У гэтай сувязі, на наш погляд, паглыбленае вывучэнне выхаваўчага вопыту, укараненне яго у штодзённую дзейнасць дасць новыя уплывы адраджэння нацыянальнай свядомасці беларускага народа.

## НЕКАТОРЫЯ МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ДАСЛЕДВАННЯ МАСТАЦКАЙ АДОРАНАСЦІ

В.Я.Баклагіна

Уступая у свет, адораны чалавек не проста авалодвае прадметамі культуры і сродкамі дзейнасці, але і спрабуе пранікнуць у іх глыбінную, усеагульную сутнасць, эмпірычна неўлоўленую у яго вопыце.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзякуючы сістэме фарміравання індывідуальных дзеянняў з гэтымі змястоўна-усеагульнымі формамі, забяспечваецца развіццё самаго чалавека, здольнага да сацыяльна-значнай творчасці, і менавіта тут выяўляюцца магчымасці вырашэння чалавечых здольнасцей, як індывідуальна прысвойваемых у ходзе утварэння усеагульных спосабаў дзейнасці.

Даследванне праблемы станаўлення і развіцця творчага чалавека ў сферы мастацкай дзейнасці павінна апірацца больш чым дзе б ні было на глыбокія тэарэтычныя і эксперыментальныя абгрунтаванні прынцыпу цэласнасці чалавека як суб'екта пазнання, працы і творчасці. Разам з такімі фундаментальнымі характарыстыкамі адоранага чалавека як сацыяльная прадуктыўнасць, працаздольнасць, даўгалецце, жыццездольнасць неабходна выдзеліць інтэгральны рэсурс чалавечага развіцця – інтэлектуальную адоранасць, выступаючую, адпаведна шматгадовым даследванням Б.Г.Ананьева і яго навуковай школы ў якасці шматузроўневай арганізацыі пазнавальных сіл, ахопліваючай псіхафізіялагічныя працэсы, стан і уласцівасці асобы і аказваючай уплыў на нэйрадынамічныя, вегетатыўныя і метабалічныя характарыстыкі, з'яўляючыеся своеасаблівымі эквівалентамі, вызначаючымі меру творчай актыўнасці і напружанасці.

У метадалагічным плане дадзеныя тэарэтычныя падставы прымяняльна да мастацкай творчасці даюць магчымасць разглядаць саздаючы вобраз як быццё ідэі, і у гэтым выпадку прынцып чалавечага успрымання "нельга бачыць не разумея", асабліва значны для выяўленчых відаў мастацкай дзейнасці, перарастае у адзінства вобразнага і уяўленчага, выліваючагася, з аднаго боку ў вобразнасць мыслення, а з другога – у інтэлектуальную глыбіню вобраза. І чым факусаваней выяўляюцца у вобразе лагічныя кампаненты, тым інтэнсіўней яго сэнсавая насычанасць, тым рэльефней ажыццяўляецца трансфармацыя ад простага гледжання да вобраза як менавіта разумеючаму бачанню.

Для таго, каб магчымый патэнцыял мастацкай творчасці – талент, настойлівасць, навыкі, веданне тых прыемаў і метадаў пабудовы вобразаў і іх матэрыялізацыі, – ператварыўся ў рэчаісны працэс стварэння, у структуры асобы будучага творцы неабходны выдучаемыя кампаненты агульнай інтэлектуальнай адоранас-

цї: сенсарна-перцэптыўны узровень рэгуляцыї, дзе функцыю кіравання дзейнасцю выконвае вобраз, і знакава-панятійны, - дзе функцыю кіравання выконваюць моўна-мысліўныя працэсы.

Пераўтварэнню усей сумы складаемых ў творчы працэс можа садзейнічаць дастаткова ранняе дыягнаставанне развіцця зазначаных кампанентаў.

І, хаця кожны адораны чалавек унікальны і кожны можа развіць свой уласны духоўны свет і здольнасць да творчасці, галоўнае заключаецца ў тым, што творчыя патэнцыі дэтэрмініраваны звонку, а менавіта, працэсам засваення вызначанага аб'ему сацыяльнай спадчыны, прабуджаючай патрэбнасць ў самастойнасці і творчай працы. Адначасова з гэтым канкрэтныя сацыяльныя праграмы у кожнага знаходзяць свой індывідуальны выраз, дзякуючы сплаву агульнага (агульначалавечага) і спецыфічнага (індывідныя характарыстыкі). Але толькі сацыяльнае атрыманне у спадчыну агульначалавечай каштоўнасці - розуму, дазволіла думаючым індывідам стварыць непаўторную своеасаблівасць нацыянальных культур, улічваючых, ў сваю чаргу, у сусветную скарбонку агульначалавечай культуры.

Бо толькі чалавек з развітым мысленнем здольны стаць сапраўдным творцай, надзеленым у сваей зместавай суці індывідуальнасцю і непаўторнасцю.

Так, развіцце мыслення становіцца іманентным патрабаваннем творчага чалавека. Каб ствараць свет і быць ў ім.

## УПЛЫЎ КУРЭННЯ НА ЗДАРОЎЕ І АКАДЭМІЧНУЮ ПАСПЯХОВАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

Л.Л.Мархоцкі

На працягу многіх гадоў намі вывучаўся уплыў курэння тытуню на здароўе і акадэмічную паспяховасць студэнтаў. З гэтай мэтай даследавана 466 студэнтаў і студэнтак. Сярод іх 167 (35,8%) курылі, а астатнія - 299 (64,2%) асоб не курылі і былі кантрольнай групай.

Намі вывучаўся ўзрост курцоў і прычыны курэння, колькасць выкурываемых цыгарэт. Паспяховасць студэнтаў вывучалася па вы-